ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 6(18)
ЛІСТАПАД 2002

2 МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ЯКОЕ ЯНО МОЖА БЫЦЬ?

4 ПАКАЛЕННЕ «NEXT», АБО ЗВЫЧКА

5 МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ: ЛІРЫКА СЯРГЕЯ ПРЫЛУЦКАГА

6 ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР: ЛІСТАПАД – ЧАС ПРЫГАДАЦЬ, ХТО МЫ

# ЦІ ДОЙДЗЕМ МЫ ДА БЕЛАРУСІ?

2 СНЕЖНЯ ПА ЗАПРАШЭННІ КЛУБА «ДЗЕДЗІЧ» У БЕРАСЦЕ ЗАВІТАЛІ ВЯДОМЫ БЕЛАРУСКІ ПІСЬМЕННІК І ГІСТОРЫК УЛАДЗІМІР АРЛОЎ І БАРД ЗМІЦЕР БАРТОСІК. УСЯГО АДБЫЛОСЯ ТРЫ ТВОРЧЫЯ СУСТРЭЧЫ: У ГІМНАЗІІ № 1, БЕРАСЦЕЙСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ І АБЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЯ ГОРКАГА. НЕАБЫКАВЫЯ ДА БЕЛАРУСКАСЦІ БЕРАСЦЕЙЦЫ АТРЫМАЛІ ЦУДОЎНУЮ МАГЧЫМАСЦЬ ПАБАЧЫЦЬ І ПАРАЗМАЎЛЯЦЬ З ПЕРАДАВЫМІ І ЗНАЧНЫМІ, НА НАШ ПОГЛЯД, ПОСТАЦЯМІ СУЧАСНАСЦІ.



**З.Бартосік. Музычны аповяд пра Вільню.**

## УЛАДЗІМІР АРЛОЎ

¨н нарадзіўся ў Полацку, ён прысвяціў яму жыццё, ён будзе там пахаваны, і на яго надмагільным надпісе, згодна беларускай традыцыі, будзе зроблена арфаграфічная памылка.

Родна. Прыемна. І балюча... Балюча цяжка слухаць мудрага чалавека, які кажа сумную праўду пра сябе і пра нас, беларусаў. Як доўга не мог выдаць у дзяржаўным выдавецтве кнігу, якая ўжо даўно мелася б выйсці, як вызваляў з рук нашай роднай надзейнай міліцыі ўдзельнікаў “Руху добрай волі”, як... Расказвае шчыра, займальна. Такіх, як Арлоў, хочацца слухаць доўга. Мяне найбольш уразіла эсэ пра незалежнасць. Гэтае эсэ заўсёды ўражвае, хоць перачытана і пераслухана шмат разоў. Напісанае больш за дзесяць год таму, яно і сёння мае права на жыццё, таму як і цяпер не страціла сваёй актуальнасці. Такое доўгае жыццё не характэрна для твораў, напісаных у жанры эсэ. Але толькі не пра незалежнасць і толькі не ў нашай краіне. На жаль. Уладзімір Арлоў выказаў надзею, што яго твор у хуткім часе ўсё ж знойдзе належнае месца ў архівах. Чаго і мы шчыра жадаем.

## ЗМІЦЕР БАРТОСІК

Раскрываў, разгортваў, выкручваў навыварат душу і быццам бы аддаваў патрымаць яе, гарачую, нам, слухачам, пакуль сам натхнёна размаўляў з гітарай. Песні спадабаліся. Надзённыя, актуальныя, месцамі іранічныя, а часам... жорсткія. У іх аўтар кпіць з сучаснай беларускай (той, якая зусім не павінна адпавядаць беларусам) рэчаіснасці, але адначасова кожным радком прызнаецца Беларусі ў каханні. Асабліва ўразіла песня “На Вільню”, куды, па словах барда, сыходзяцца дарогі кожнага беларуса. “Гэты горад проста так не пакідаюць,” – гаворыць Бартосік яшчэ ў адной песні пад назвай “Развітанне з Вільняй”. Вільня, гэтая “сцэна дэкарацыяў да розных стагоддзяў беларускай гісторыі”, цяпер чужая і далёкая нам тэрытарыяльна, але не духоўна. Як відаць, былая сталіца Вялікага Княства займае вялікае месца ў душы і творчасці Бартосіка. Хацелася б заўважыць, што штодзённай мовай зносінаў Зміцера Бартосіка з’яўляецца беларуская. І гэта пры тым, што ў радаводзе барда няма ніводнага беларуса (ён выхадзец з расейскай тэатральнай сям’і). Што ні кажы, Беларусь прыцягвае і ўлюбляе ў сябе! І таму дзіўна, нават з нейкім сорамам, успрымаецца Бартосікава беларускасць. Чалавек вывучыў і палюбіў нашую мову, даследаваў гісторыю, а цяпер складае такія балюча трапныя, такія зразумелыя нам, беларусам, песні...

Моладзь, якая пабывала на сустрэчы з Уладзімірам Арловым і Зміцерам Бартосікам, - шчаслівая. Разуменне гэтага, калі яшчэ не прыйшло, дык абавязкова прыйдзе пазней. Шчырыя сустрэчы са шчырымі беларусамі абагачаюць.

**Алена МА¨ВАЯ**

**P.S. А для жадаючых пазнаёміцца бліжэй з творчасцю нашых гасцей паведамляем, што ў «Дзедзічы» можна набыць іх кніжкі па коштах, значна ніжэйшых за дзяржаўныя.**



**У.Арлоў выступае перад студэнтамі БрДУ**

## АДНЫМ РАДКОМ

### НЕ ХЛЕБАМ АДЗІНЫМ...

У пятніцу, 15 лістапада, па запрашэнні клуба "Дзедзіч" Берасце наведаў вядомы беларускі паэт Леанід Дранько-Майсюк. Падчас візіту паэта адбылося дзве яго сустрэчы з берасцейскай моладдзю.

У $14^{10}$ творчая сустрэча прайшла ў ліцэі № 1 з навучэнцамі і настаўнікамі гэтай установы, затым у $16^{00}$ – са студэнтамі і выкладчыкамі Берасцейскага дзяржаўнага універсітэта. Сустрэчы прайшлі вельмі цікава ў форме жывога дыялогу паэта з аудыторыяй. Гучалі вершы, напісаныя шмат гадоў назад, а таксама створаныя нядаўна. Паэт расказаў цікавыя гісторыі са свайго дзяцінства і юнацтва, цікава было паслухаць аповяд пра яго шматлікія вандроўкі па замежных краінах. Аудыторыя цёпла сустрэла творцу, як заўсёды сустракаюць сваіх землякоў (Л.Дранько-Майсюк нарадзіўся ў Давыд-Гарадку).

Разам з паэтам у наш горад прыехала прадстаўніца менскага выдавецтва "Кніга" Людміла Несцяровіч. Падчас сустрэч быў наладжаны продаж апошняй кнігі Дранько-Майсюка "Паэтаграфічны раман", а таксама выданняў, што пабачылі свет у выдавецтве "Кніга" апошнім часам. Сярод іх – творы Васіля Быкава, Ніла Гілевіча, Янкі Купалы і іншых. Адметна тое, што ў выдавецтве "Кніга" выходзяць творы выключна беларускіх пісьменнікаў. Прадаваліся кнігі без гандлёвай надбаўкі, таму кожны студэнт змог дазволіць сабе прыдбаць каштоўную рэч – кнігу.

Сябры клуба "Дзедзіч" зацікаўленыя ў папулярызацыі беларускай мовы і культуры, павышэнні нацыянальнай самасвядомасці беларускай моладзі, таму ў бліжэйшым будучым плануюцца таксама сустрэчы з беларускімі творцамі Рыгорам Барадуліным і Нілам Гілевічам.

**Dzedzich week-news**

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Клуб "Дзедзіч" распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя.

Калі Вы ведаеце МА ў вашым рэгіёне, якія былі б зацікаўлены ў атрыманні нашай рассылкі і ў асвятленні сваёй працы на яе старонках, просім паведаміць нам іх кантакты.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы. Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет напрыканцы снежня 2002г.**

**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 22-90-97 да 22.12.02.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЯКОЕ ЯНО МОЖА БЫЦЬ?

2 САКАВІКА – МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ. ЗГАДЗІЦЕСЯ, МЫ НЕ ВЕЛЬМІ ЎВАЖЛІВА ПРЫГЛЯДАЕМСЯ ДА ІХ. ГЭТА Ж НЕ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ, ЦІ ХАЦЯ Б ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ, ДЗЕ ВЫБРАЎ – І АДРАЗУ ЗРАЗУМЕЎ, ШТО ВЫБРАЎ НЕ ТАГО. А НА МЯСЦОВЫХ... ВЫБІРАЕШ НЕ ВЫБІРАЕШ – ВЫНІКУ НІЯКАГА НЕ БАЧНА.

Не ведаю як у Вас, паважаныя чытачы, а ў мяне колькі гадоў тыя ж самыя пытанні застаюцца без адказу. Чаму ў маім мікрараёне абшарпаны сцены дамоў, разбіты ліхтары, тратуары ў выбоінах, а ўлады вось ужо які год не могуць іх залатаць? Чаму прадпрымальнікаў абклалі такім падаткам і наслалі столькі кантралёраў, што яны вымушаны згарнуць сваю дзейнасць, а я – ездзіць за некаторымі таварамі на другі канец горада? На гэтыя звычайныя пытанні ў нас зараз няма адказаў. А як у іншых краінах?



Галасую з надзеяй... Фота: IREX/ProMedia

Дзесяць гадоў таму гэтыя ж праблемы грамадзянам краін "сацыялістычнага лагера" здаваліся невырашальнымі. Іх лёс зусім не цікавіў чыноўнікаў, з якімі звычайны чалавек павінен быў штодзённа змагацца. І гэта зразумела, таму што яны, як і зараз у нашай краіне, прадстаўлялі інтарэсы ўлады, а не грамадзян. Прайшло дзесяць гадоў, і аказалася, што такі стан зусім не абавязковы.

Да мясцовай улады прыйшлі сапраўдныя прадстаўнікі мясцовай грамадскасці – людзі, якія мелі сваё бачанне перамен, нескарумпаваныя і энэргічныя. Менавіта мясцовая ўлада цяпер дбае пра школы, паліклінікі, дарогі і вуліцы, збірае падаткі, падтрымлівае развіццё прадпрымальніцтва. І хоць не ўсе праблемы зніклі, як гэта бывае пасля ўзмаху чарадзейнай палачкі, але сёння ўжо ні адзін міністр не вырашае, хто будзе дырэктарам школы, колькі дактароў патрэбна ў здраўпункце, ці як будзе называцца тая ці іншая вуліца. Сапраўднае мясцовае самакіраванне паспрыяла таму, што мільёны людзей пачалі праяўляць ініцыятыву, адчуўшы сябе гаспадарамі на ўласнай зямлі. Як грыбы пасля дажджу пачалі ўзнікаць прыватныя прадпрыемствы, невялікія крамы і супермаркеты, будаўнічыя фірмы, рынкі, гатэлі і кінатэатры, прыватныя школы і музеі, даючы людзям месцы добра аплочваемай працы і, зразумела, папаўняючы як мясцовы, так і дзяржаўны бюджэт. Змяніўся выгляд гарадоў, значна палепшыўся стан экалогіі і дарог...

Не трэба нічога выдумляць новага, каб мець тое ж самае і ў нашай краіне. Такая сістэма мясцовага самакіравання існуе ў шматлікіх заходніх краінах ужо амаль сто гадоў. І на нашай зямлі яна існавала на працягу стагоддзяў, пакуль самадзяржаў'е, а потым дыктатура пралетарыяту не вынішчылі яе.

Зразумела, пакуль у нашай краіне цэнтральная ўлада ёсць такая як ёсць, мясцовыя саветы не маюць вялікіх паўнамоцтваў. Але маючы сапраўдных прадстаўнікоў нашых інтарэсаў на мясцовым узроўні, мы зробім вялікі крок да тых пераменаў, якіх мы ўсе даўно чакаем!

**Уладзімір ТАРНОЎСКІ**

**Шаноўныя сябры! Калі Вы падтрымліваеце гэты зварот да кіраўніцтва ААТ «Брэсцкае піва» - запоўніце анкету і дашліце на адрас рэдакцыі.**

## АДКРЫТЫ ЗВАРОТ МАЛАДЫХ АМАТАРАЎ ПІВА

Мы, берасцейскія аматары піва, любім прадукцыю нашага бровара і радуемся з'яўленню кожнага новага гатунку. Аднак нас засмучае, што ў афармленні Вашай прадукцыі выкарыстоўваецца выключна руская мова. Прыкра, што кіраўніцтва ААТ "Брэсцкае піва" цалкам ігнаруе дзяржаўную беларускую мову. Для многіх людзей, асабліва для моладзі, піва – адзін з любімых напояў, але нам таксама неабыякавы і стан беларускай культуры. Мы мяркуем, што прэстыж і клопат аб ёй – такая ж важная справа, як і падтрымка айчыннай прадукцыі ды яе вытворцаў. У якасці добрага прыкладу павагі да роднага можна ўзгадаць лідскі піўзавод (піва "Старажытнае", "Вітаўт" і інш.), менскія заводы "Крыніца" і "Аліварыя" (піва "Крыніца", "Партызанскае", "Бурштын Беларусі", "Аліварыя" і інш.). І гэта адна з прычын, якая робіць усё больш папулярным сярод моладзі менавіта гэтыя гатункі піва. Нас здзіўляе і крыўдзіць, што ў ААТ "Брэсцкае піва" не дбаюць пра прэстыж і папулярнасць свайго піва сярод самых адданых аматараў – беларускай моладзі.

З гэтай прычыны мы настойліва просім Вас выкарыстоўваць у афармленні прадукцыі Вашага прадпрыемства родную нам і Вам беларускую мову, а для новых гатункаў піва прапануем шукаць адметныя беларускія найменні. Спадзяемся на разуменне, падтрымку і супрацоўніцтва.

| № пп | Прозвішча, імя і імя па бацьку | год нараджэння | адрас | подпіс |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

# БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДУ.

26 ЛІСТАПАДА1930 Г. У ВОРШЫ НАРАДЗІЎСЯ УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ, ВЫДАТНЫ БЕЛАРУСКІ ПРАЗАІК І ПАЭТ. ЁН, ЯК НІХТО ІНШЫ, ЗМЯНІЎ У XX СТАГОДДЗІ СВЕТАПОГЛЯД БЕЛАРУСАЎ. ЯГОНЫЯ КНІГІ, КІНАСЦЭНАРЫ І П'ЕСЫ СТАЛІ ПАДМУРКАМ НАЙНОЎШАГА БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ.



Пра Уладзіміра Караткевіча можна казаць многа: можна называць яго рамантыкам, можна казаць, што ягоныя творы занадта сентыментальныя, але Караткевіча нельга не чытаць. Бо ў кожным радку – проза гэта ці паэзія – скразной лініяй праходзіць тэма Любові: Любові да Радзімы, Любові да Жанчыны. І зусім не істотна, што нярэдка Радзіма і Жанчына ў творчасці мастака ўзаемазамяняюць і ўзаемадапаўняюць адна адну, пераплятаюцца і перакрыжоўваюцца, утвараючы на белай прасторы чалавечай душы складаныя лабірынты пачуццяў. І няма ніякай розніцы, як адкажаш Ты на пытанне: "Каго Любіш?" – "Беларусь", або "Жанчыну" - бо адказ будзе ісці ад самога сэрца, ад самых далёкіх закуткоў душы (хіба ж можа быць няшчырым прызнанне ў Каханні?).

Уладзімір Караткевіч марыў пра Беларусь. Пра Краіну, пралятаючы над якой, анёлы аднойчы б сказалі: "Яны ўжо не натоўп", пра Краіну, у якой людзі не выракаліся б Мовы Бацькоў, не выракаліся б уласнай гісторыі. Пісьменнік марыў пра "зямлю пад белымі крыламі" (можа пад крыламі тых самых анёлаў, якія аднойчы сказалі: "Яны йшчэ не народ..."?), ён марыў пра той момант, калі Беларусь "зойме свой пачэсны пасад між народамі".

Аднак пасля камуністычнага катавання Беларусь напаткала новая навала – Праваслаўны Атэізм. Дык ці ж маем Мы права ў гэты складаны гістарычны перыяд выракацца Беларусі, ці маем Мы на гэта права?!

Памятаеце: "Прадавалася Радзіма..." – так пісаў Караткевіч пра часы паўстання Васіля Вашчылы, відавочна маючы на ўвазе 70-80 гг. XX стагоддзя, а зараз – ці змянілася нешта зараз? Не.

На жаль, сёння майстра няма побач з намі - смерць заўсёды забірае лепшых сыноў. Людзі паміралі і будуць паміраць. Адны, стоячы па калена ў гноі, іншыя, – узняўшыся ў поўны рост і пракрычаўшы ва ўвесь голас: "No Pasaran!". Адных адпяваюць на могілках плакальшчыцы-найміткі (што можа быць больш ганебнае за прададзенае пачуццё?), іншым на могілках граюць паланез Агінскага... Іншым... тым,

"... якія сабой заплацілі
За Айчыну і слова, племя і род,
І душу аддалі, каб яна ажывіла
Мёртвы гліны камяк:
Свой родны народ."

І зараз, плывучы на жыццёвай "лаздзі роспачы", шмат каго зберагае і не дазваляе паддацца адчаю чырвоная кветка шыпшыны – творчасць Уладзіміра Караткевіча.

**Андрусь УРУБЛЕЎСКІ**

# «ДЕДИЧУ» ТРИ ГОДА!

***«Когда я в первый раз пришёл на праздник в «Дедич», мне понравилось, а потом уже мне пришлось заниматься организацией праздников, чтобы нравилось другим...»***

**ДИКИЙ.**

БЫСТРО И НЕЗАМЕТНО ПРОЛЕТЕЛО ВРЕМЯ. ВОТ УЖЕ ТРИ ГОДА, КАК СУЩЕСТВУЕТ КЛУБ. ЕЩЁ, КАЗАЛОСЬ, СОВСЕМ НЕДАВНО ОТМЕЧАЛИ МЫ ПЕРВЫЙ «ДЕНЬ РОЖДЕНИЯ» ОРГАНИЗАЦИИ, КАК НАСТАЛО ВРЕМЯ ОТМЕЧАТЬ ТРЁХЛЕТИЕ. И ПРАЗДНИК УДАЛСЯ!

«День рождения» решили отмечать 24 ноября. Собрались своей «маленькой семьёй». Было нас всего ничего – человек 15. Праздник открылся в $19^{00}$ торжественной речью председателя – Шиманского Дмитрия, после его тоста выпили шампанское. Прозвучало ещё несколько речей, и все переместились к столу.

Именно в этот момент я постарался «подловить» каждого на «фант» и, соответственно, рассказать случай из жизни. Большинство рассказывало, как они «пришли в «Дедич»». После этого мы «перекочевали» в зал, где я предложил участникам сыграть в лотерею, главный приз которой – бутылочка пива – достался Татьяне, девушке, которая буквально на днях познакомилась с нами. А потом, попивая лёгкое вино, мы играли в различные игры и конкурсы. Всем наверняка понравилась игра «Паровозик», конкурсы на лучшего рисовальщика ногой, лучшего уничтожителя документов и множество других. А как насчёт лучшего переселенца, когда надо было заселить воздушный шарик как можно большим количеством людей? Было очень весело и смешно.

Ближе к $23^{00}$ я зачитал номинации для наиболее «старых и знаменитых» людей «Дедича» (каждый из нас говорил о других, а я в итоге составил «суждения»). Затем народ стал понемногу расходиться, хотя последние разошлись после полуночи…



Когда-то, ещё на первом «Дне рождения», нам пожелали, чтобы нас было всё больше и больше. Кажется, это послание начинает сбываться.

Как бы не сглазить.

**ДИКИЙ**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ПАМЯЦЬ І ПАВАГА

Унядзелю, 1 снежня, ініцыятыўная група берасцейцаў ладзіла акцыю, прысвечаную 82-м угодкам Слуцкага збройнага чыну і паходу на Беларусь войскаў ген. Булак-Балаховіча.

Акцыя, удзел у якой узяло ўдзел каля дваццаці чалавек, праводзілася на Балахоўскіх могілках (р-н мясакамбінату на Рэчыцы), дзе знайшлі спачын жаўнеры войска Булак-Балаховіча. Адбылося асвячэнне помніка, праведзена кароткая паніхіда па загінуўшых за волю Бацькаўшчыны, былі ўскладзеныя кветкі.

Трэба адзначыць, што зараз частка Балахоўскіх могілак забудаваная гаражамі...

**Dzedzich week-news**

### КОНКУРС ЭСЭ «ПРАБЛЕМА ВІЧ/СНІДУ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ»

Конкурс эсэ сярод дзяцей і моладзі «Праблема ВІЧ/СНІДу вачыма дзяцей» распачаўся 1 снежня 2002 года ў межах сумеснага праекта Аб'яднанай праграмы ААН па ВІЧ/СНІДу, Праграмы развіцця ААН(ПРААН) і прадстаўніцтва Хрысціянскага Дзіцячага Фонду ў Беларусі.

Дасланыя эсэ будуць разглядацца ў дзвюх намінацыях: «Сябар, хворы на СНІД, - усё роўна сябар», «Я адказны сам за сябе ў свеце, дзе існуе СНІД».

Пасля падвядзення вынікаў конкурсу будуць выяўлены пераможцы, якіх чакаюць каштоўныя падарункі і дыпломы ад прадстаўніцтваў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і Хрысціянскага Дзіцячага Фонду ў Беларусі.

Акрамя таго, эсэ, якія пераможуць на конкурсе, увойдуць у ілюстраваны зборнік, што будзе выдадзены на расейскай і ангельскай мовах пры падтрымцы ПРААН у Беларусі.

Тэрмін падачы прац - да 1 лютага 2003 года. За дадатковай інфармацыяй звяртацца да Фейруз Аль-Маалуф па т. 227-78-22, 227-48-76.

**Dzedzich week-news**

### АДКРЫТЫ ЛІСТ

Нядаўна на адрас "Дзедзіча" быў дасланы загадкавы ліст без подпісу і зваротнай адрэсы. Тэма, узнятая ў лісце, сёння больш чым актуальная, і сам ліст нас вельмі ўразіў. Мы вырашылі падзяліцца з Вамі нечым болем, і таму цалкам прыводзім змест ліста:

"Паважаны грамадзянін!

Мы звяртаемся да Вас з вялікай просьбай: любіце і праяўляйце міласэрнасць да братоў нашых меншых!!!

Ці ведаеце Вы, што толькі за мінулы год "санітары горада" вылавілі амаль 13 тысячаў беспрытульных жывёлаў? Спайманых "брадзяжак" забіваюць, прымяняючы 25% раствор аміяку. Для жывёлы гэта – неверагодныя пакуты. І хоць існуе прэпарат, які дазваляе ўсыпіць жывёлу абсалютна бязбольна, яго не выкарыстоўваюць!

Не выкідвайце на вуліцу сабачак і коцікаў, праявіце міласэрнасць. Сабачае сэрца ведае, што такое адданасць, чалавечае ведае, што такое любоў...

Аматарскае таварыства".

Са свайго боку выказваем шчырую салідарнасць з аўтарамі ліста і прапануем ім сваю дапамогу ў памнажэнні і распаўсюдзе гэтага звароту.

**Dzedzich week-news**

# ПОКОЛЕНИЕ «NEXT», ИЛИ ПРИВЫЧКА

УДИВИТЕЛЬНАЯ ВЕЩЬ - ПРИВЫЧКА. ПРОШЛО МЕНЬШЕ ДЕСЯТИ ЛЕТ С ТЕХ ПОР, КАК Я ВПЕРВЫЕ УСЕЛСЯ ЗА КЛАВИАТУРУ МЕХАНИЗМА, БОЛЕЕ ИЛИ МЕНЕЕ ЗАСЛУЖИВАЮЩЕГО ЗВАНИЯ «ПЕРСОНАЛЬНЫЙ КОМПЬЮТЕР», А СЕЙЧАС УЖЕ У МЕНЯ НЕ ВЫЗЫВАЕТ НИКАКОГО УДИВЛЕНИЯ ЗРЕЛИЩЕ СИДЯЩЕЙ ЗА КОМПЬЮТЕРОМ МОЕЙ ТРИНАДЦАТИЛЕТНЕЙ СЕСТРЫ, СИЛЬНО ОЗАБОЧЕННОЙ ПРОБЛЕМОЙ ЗАЩИТЫ ДАННЫХ И ЧИТАЮЩЕЙ ПО ЭТОМУ ПОВОДУ КАКОЙ-ТО ЖУТКО СПЕЦИАЛЬНЫЙ САЙТ.

## КОМПЬЮТЕРЫ И БРАТЬЯ (СЕСТРЫ) НАШИ МЕНЬШИЕ

Или вечная борьба еще одного компьютерного ветерана - соседа Игоря с его младшим братом (10 лет). Игорь постоянно придумывает способы не дать брату залезть в его компьютер, а брат с упорством, заслуживающим лучшего применения, эти защитные барьеры обходит, а по дороге в школу и обратно читает толстенный справочник по Windows 98 (и, между прочим, отнюдь не издание для чайников).

## СЧАСТЛИВОЕ ПРОШЛОЕ ZX SPECTRUM (С БАЙТОМ В ОБНИМКУ)

Как сейчас помню: стоила машинка семь тысяч рублей, а у меня было только шесть - еще одну мне удалось выпросить у деда. Я приволок компьютер домой, прочитал руководство по эксплуатации на пяти страницах и решил попробовать во что-нибудь поиграть.



Я долгими зимними вечерами развлекал себя игрой «Вертолетик-летит-по-экрану-и-стреляет-палочками-в-самолетики», которая, вообще говоря, называлась Chopper, но я ее звал просто и понятно - «Шоппер»... Никто и не мог предположить, что буквально через несколько лет подрастет поколение, устремления которого даже отдаленно не будут похожи на наши в их возрасте.

Взять, к примеру, мою сестру, которая, как мне кажется, принадлежит к лучшей части подросшего поколения. Правда, это совершенно не мешает мне периодически оказываться в полном логическом тупике при попытке понять, как же протекают мыслительные процессы представителей этого поколения. Но речь не об этом. Ребенок начал проявлять интерес к компьютеру брата (то есть меня) уже лет с пяти.

Если поначалу все ее пожелания сводились к просьбе порисовать чего-то там прикольное в Paint, то уже через полгода я перед уходом из дома вынужден был проверять, не снял ли я случайно пароль с BIOS, ибо сестра начала проявлять недюжинный интерес к различного рода хрупким приложениям и программным конструкциям, с которыми мне раньше времени расставаться совершенно не хотелось.

Хотя, как показали дальнейшие события, пришлось, ибо однажды сестре удалось-таки раздобыть книжку по командам DOS, и в мое отсутствие она села с ними разбираться. Команду format c: сестра вводить не стала, так как уже в то время отчетливо себе представляла, что такое системные файлы, а вот format d: ей показался интересным вариантом… Хм, нда. Даже вспомнить страшно.

Еще через пару месяцев я совершенно случайно обнаружил, что Машка (а именно так и зовут мою сестру) не только разобралась в том, что такое Award BIOS и как оно работает, но и где-то раздобыла инженерный пароль к нему - и совершенно спокойно втихую копалась в моей машине.

Наше противостояние вышло на следующий виток своего развития. Я придумывал все новые и новые способы уберечь компьютер от вторжения посторонних. Больше всего хлопот Машке доставил шнур питания, который я начал просто немного вынимать из разъема. Получалось так, что с виду все нормально, а вот тачка не заводится. На решение этой головоломки у сестры ушла неделя. Потом я начал просто прятать шнур питания, совершенно упустив из виду тот факт, что сестра давно уже свистнула у меня один из запасных, хранила его где-то в кладовке и пользовалась по мере надобности.

С тех пор прошло уже несколько лет, и у Машки уже есть свой собственный компьютер, за которым она проводит большую часть своего свободного времени, сидит ночами в Сети и занимается там малопонятными мне вещами.

## ЧАТЫ

Вот, например, чаты. Сестра никогда не указывает свой настоящий возраст, предоставляя собеседникам возможность определять его самостоятельно. Надо ли говорить, что девушке, которая со знанием дела рассуждает о новых веяниях в Голливуде, помнит всех партнеров Квентина Тарантино во всех его фильмах, периодически разводит своих собеседников на разговоры о проблеме девственности применительно к социализации личности и влюбляет в себя по Сети товарищей, которым уже далеко за двадцать, - никто меньше




18 лет не дает.

Степень вольности своих сетевых бесед сестра тщательно, пусть и не очень успешно, скрывала от родителей, так как мой родитель компьютер, мягко говоря, не любит как категорию, а к интернету относится еще более подозрительно.

Естественно, рано или поздно тематика разговоров моей сестры должна была стать известной моим родителям, и наконец это знаменательное событие произошло. Не могу сказать, что родители сильно впечатлились, но, по крайней мере, приняли информацию к сведению. Активно развиваться ситуация начала после того, как домой начали звонить Машкины поклонники, чем сильно напрягали моего отца.

В общем, дело шло к тому, что Машку отлучат от интернета «вдребезги и пополам» и до достижения ею совершеннолетия Сети ей не видать как собственных ушей (мой родитель - весьма решительный человек). Машка, услышав это, немного пообвиняла всех в нарушении прав детей, после чего удалилась к себе в комнату расстраиваться и думать о смысле жизни.

После недолгого, но весьма занятного обсуждения сложившейся ситуации мы с родителями пришли к консенсусу. Машка была оторвана от чтения модного журнала, и ей было заявлено, что отныне на ее компьютере будут установлены программы, регистрирующие все ее переговоры по аське и в чатах.



Через некоторое время, поглядывая на экран, я пришел к выводу, что темы общения моей сестры стали значительно скромнее, что означало серьезное отношение к моей угрозе. Но прошло еще некоторое время, и все вернулось на круги своя. Дело в том, что сестра не обломалась разобраться в ситуации и с уверенностью сделала вывод, что никаких логгеров на ее машине не стоит.

## МЫ И МЛАДШЕЕ ПОКОЛЕНИЕ

Больше всего меня поражает в современных детях полное отсутствие почтения по отношению к компьютеру. Они воспринимают его как агрегат, как нечто среднее между миксером и видеомагнитофоном, то есть как что-то настолько обыденное, насколько это в принципе возможно. И это есть хорошо, так как уже стало понятно, что неправы были многочисленные футурологи, обещавшие возникновения культа компьютеров уже в обозримом будущем. Не будет ничего такого, как не было и не предвидится возникновения религии, допустим, стиральных машин.

**Максим СЕЛЯГИН**

## МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ



ЛІРЫКА СЯРГЕЯ ПРЫЛУЦКАГА – МЕДЫТАТЫЎНАЯ, БО ВЫЯЎЛЯЕ НАЙПЕРШ САМААСЭНСАВАННЕ І САМАСПАСЦІЖЭННЕ ЛІРЫЧНЫМ ГЕРОЕМ СВАЙГО МЕСЦА І СУТНАСЦІ ЎЛАСНАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ Ў ГЭТЫМ РАЗМАІТЫМ, ДАЛЁКІМ АД САПРАЎДНАЙ ГАРМОНІІ ЖЫЦЦІ. ПА-ФІЛАСОФСКУ ЗАНЕПАКОЕНА ЁН РАЗВАЖАЕ АБ МЭТАХ ЧАЛАВЕЧАГА ПРЫХОДУ Ў ГЭТЫ СВЕТ. МАЛАДЫ АЎТАР МАЕ ПРЫВАБНУЮ ЎЛАСНУЮ КАНЦЭПЦЫЮ: ЖЫЦЦЁ – ГЭТА ПАЛЁТ, І ЧАЛАВЕК ПАВІНЕН ЗАВЯРШЫЦЬ ЯГО НЕ ПАДЗЕННЕМ У ПРОРВУ-НЯБЫТ, А ЎЗЛЁТАМ У ВЫШЫНЮ, І ЗАСТАЦЦА Ў ПАМЯЦІ ІНШЫХ ВЫСОКІМ, НЕДАСЯЖНЫМ. ЯМУ ЦЕСНА Ў "МАРАЛЛЮ СЦІСНУТАЙ ПРАСТОРЫ".

"ПОШУК НЕДАСЯГАЛЬНАЙ ПРАЎДЫ ЖЫЦЦЯ" – ТАК СЛОВАМІ САМОГА СЯРГЕЯ ТРАПНА ВЫЗНАЧАЕЦЦА СУТНАСЦЬ ЯГО ТВОРЧЫХ ПОШУКАЎ І ЎЖО ПЭЎНЫХ ЗНАХОДАК, БО Ў БОЛЬШАСЦІ ЯГО ВЕРШАЎ, САПРАЎДЫ, "СЛОВА СТАНОВІЦЦА ЧЫННІКАМ". НЯХАЙ ГЭТА ЎДАЕЦЦА І ДАЛЕЙ.

**Зоя МЕЛЬНІКАВА,**
**кандыдыт філалагічных навук,**
**дацэнт Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта**

### РЭЧ

*"Прыбудуць барбары, у іх свае законы".*
*К. Кавафіс, "У чаканьні барбараў"*

– Чаму няма ў сталіцы ні душы ?

– Кароль інкогніта ад'ехаў за мяжу
да знанае ўсеўладнае каханкі
з каштоўнымі дарамі – месьціччу й віжу
дзяржаўнаму дакладны знак заранкі
нядоўгага разрыву з каралевай і каронай.
На ўцеху паспалітым і разбэшчаным баронам.

– Калі ж пачнецца праца над законамі,
ці скліча хто, нарэшце, Вальны Сойм?

– Няма каму. Штодзённа па лясох
магнацтва п'янае са шляхтаю напару
ды ўсёй астатняй поскудзьдзю, у рог
гарланячы, ганяюцца за дзічынаю. Марна
чакаць: палацы ўласнай годнасьці
здалі за пярсьцёнкі бяздумнае сквапнасьці.

– Ужо каторае сьвята званоў не чуваць.
Дзе падзелася наша духоўная знаць?

– Патрыярх у турэцкім сядзіць капкане,
даўно ўжо ня той, як калісь. Цёмнавокі,
перачытвае ўвечар лісты з Ватыкану:
рэлігійныя гульні ды эківокі
абышліся задарага. Цэркваў-касьцёлаў
ад агню не схаваць ні сьвятым, ні анёлам.

– Па той бок, на памежжы – штыхоў варушэньне.
Ці спадзявацца нам на паспалітых рушэньне?

–Нямае ўжо тут ані войска, ні ўлады.
Дыпламаты нясьпешна нясуць у архівы
скруткі новых дамоваў, парады
даючы генэралам. Выпісваюць ксівы
адпаведным намесьнікам. Хворая Рэч
у перадсьмяротнай агоніі ўскідвае меч.

### ПРАВІНЦЫЯ

Дарогі ды грэблі паўсюдна, нізіны й лясы.
Далёка да Вільні, да межаў, што – добра, бо тут
прыносяць вялікія грошы бізун і хамут.
Заўсёды было так і будзе ва ўсе часы.

Калі-нікалі прыязджае аднекуль ганец
з добраю весткай альбо з вайной-навінай
для прышлых удоў, і тыя разам з труной
купляюць уборы ды вэлюм сабе пад вянец.

А недзе далёка напышлівы зброд
уважна глядзіць як стары Гаспадар
памірае паціху на полі ад ран.

Зелянее дзірван, каля прыпяцкіх вод
самотна блукае заморскі штукар.
І плыве па-над пожнямі лёгкі туман.

***

Вяртацца назад няма ні жаданьня, ні сэнсу, ні нават магчымасьці, бо
паўкола замка ўжо замкнулася, ключ пераплавіўся ў крук
катавальні, у аўтасалдата – вой
нідзе не вядомай дзяржавы і веры;
з рук
ня вырвеш металь, як і ўсім дараваньня з вуснаў, бо дым
па-над мёртвай Айчынай выдае паволі і сэрца, і вочы,
бо зьмяніць краявід немагчыма, хіба замяніць яго тым,
які па дарозе ў выгнаньне цябе забівае двойчы.

# АЛЬФА-ВЕРСИЯ WINDOWS LONGHORN

20 НОЯБРЯ В ИНТЕРНЕТЕ ПОЯВИЛСЯ ВНУТРЕННИЙ АЛЬФА-БИЛД СЛЕДУЮЩЕЙ ВЕРСИИ WINDOWS, НОСЯЩЕЙ КОДОВОЕ ИМЯ LONGHORN.

Данная версия позволяет составить неплохое представление о будущих планах Microsoft. Интерфейс системы немного отличается от интерфейса Windows XP и носит название «Plex». Кардинальное нововведение – замена панели задач на боковую панель (Longhorn Sidebar). Sidebar использует XML для отображения некоторых функций, например, виртуального рабочего стола, поиска в интернете и системных часов. Меню «Пуск» также может быть вызвано из Боковой панели, так что необходимость использования панели задач отпадает в принципе. Вместо диалогового окна «Свойства экрана» имеется недоработанная конфигурационная панель на основе XML, использующая новый API под кодовым названием Avalon.




В общих чертах, это концепция информационного окружения пользователя. Согласно ее основной идее, файлы больше не будут распределяться по своему физическому местоположению, вместо этого они будут организованы контекстным образом или же каким-либо другим способом, определенным пользователем или администратором. Как сказал один из разработчиков API, «новый подход коренным образом изменит способ взаимодействия пользователя с компьютером». В альфа-билд включена и новая файловая система Longhorn - WinFS, однако она также не завершена и существенно снижает производительность системы. В «Сведениях о системе» новая ОС идентифицирует себя как Windows 6.0.

**Максим СЕЛЯГИН**

# ПОКУРИМ?

## ИЗ-ЗА КУРЕНИЯ ЕЖЕГОДНО В МИРЕ УМИРАЕТ 8 МИЛЛИОНОВ ЧЕЛОВЕК

Медики, собравшиеся на конгрессе в Дюссельдорфе, пришли к выводу, что курение ещё опаснее, чем сегодня принято считать. Участники совещания сошлись во мнении, что даже диабет не идёт ни в какое сравнение с опасностью, которую представляют сигареты. По оценкам экспертов, от болезней, связанных с употреблением табака, во всём мире ежегодно умирает 8,4 миллиона человек. Такая динамика сохранится как минимум до 2010 г. Прежде всего, курение смертельно, поскольку является причиной сердечно-сосудистых заболеваний, а также рака. Кроме того, употребление табака приводит к заболеваниям желудка, печени, почек и так далее.

## НА УЛИЦАХ ТОКИО ЗАПРЕТИЛИ КУРИТЬ

В административном районе Токио с 1 ноября 2002 года запрещено курить на остановках общественного транспорта и в других местах скопления людей. Курильщикам был дан месяц на избавление от пагубной привычки, теперь за нарушение новых правил им придется платить штраф в 20000 йен ($167). За месяц до введения запрета на курение на улицы токийского района Тиёда (Chiyoda), где расположены здания парламента и императорского дворца, вышли патрули. Они предлагали курящим затушить сигареты в портативных пепельницах и разъясняли им новые правила. Жители района считают, что теперь дети и взрослые не будут нюхать дым в общественных местах, а на улицах станет чище. Однако, сторонники курения полагают, что запрет не будет выполняться. В Японии курит каждый четвертый. Ученики старших классов могут свободно купить табачные изделия, несмотря на соответствующий закон.

**Максим СЕЛЯГИН**



**На фото: акция украинских и американских студентов против курения. Киев.**

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# ЛІСТАПАД – ЧАС

## 1 ЛІСТАПАДА

У гэты дзень, 1 лістапада 1987 г., у Беларусі ўпершыню адбылося публічнае адзначэнне **Дзядоў** (дзень памяці продкаў) шляхам грамадскай акцыі. З тых часоў гэты дзень адзначаецца штогадова.

Археолаг і антраполаг **Глеб Бонч-Асмалоўскі** нарадзіўся ў Пухавіцкім р-не ў 1890г. ¨н першы на тэрыторыі краіны выявіў парэшткі неандэртальца, вывучаў палеалітычныя паселішчы. І што? Антысаветчык, вораг народа, сасланы яшчэ ў 1934г., а 1 лістапада 1943-га недзе ў ГУЛАГу і памёр.

Пісьменнік **Вячаслаў Адамчык** прыйшоў на свет 1 лістапада 1933 г. Адамчык праславіўся раманам "Чужая Бацькаўшчына", а таксама сваімі сынамі, якія таксама сталі літаратарамі і пішуць пад псеўданімамі **Адам Глёбус** і **Міраслаў Шайбак.**

## 2 ЛІСТАПАДА



У гэты дзень 1909 г. ў вёсцы з каларытнай назвай Прусы, што цяпер у Салігорскім раёне Меншчыны, нарадзіўся **Максім Лужанін**. Лужанін (сапраўднае імя яго было Аляксандр Каратай) быў адным з найстарэйшых беларускіх паэтаў-сучаснікаў, бо друкавацца пачаў ажно з 1925 г. Пяру паэта належыць шмат вершаў, паэм, публіцыстычных артыкулаў. Да вайны Лужанін працаваў у часопісе "Узвышша", потым – на Беларускім радыё, а з 1935 па 1941 гг. – у маскоўскіх выдавецтвах. Перажыў трагічныя часы 37 – 39-га... А па вайне працаваў у газеце "Звязда", у часопісе "Вожык", затым быў галоўным сцэнарным рэдактарам на "Беларусьфільме". Заўважым, што ягонай жонкаю была выдатная паэтка Яўгенія Пляўфбаўм. Памёр Лужанін у 2001 г., не дажыўшы восем гадоў да ўласнага стагоддзя.

## 3 ЛІСТАПАДА

У гэты дзень 1880 г. нарадзіўся **Канстанцін Пушкарэвіч**, выбітны філолаг, даследчык беларускай літаратуры, гісторык, перакладчык. Жыў і працаваў ён пераважна ў Расеі. Гэта быў чалавек цікавы і шматгранны. ¨н удзельнічаў ў працы Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі ў 1912г., быў адным з арганізатараў беларускага навукова-літаратурнага таварыства студэнтаў Петраградскага універсітэта ў1917г. Вядомы Канстанцін Пушкарэвіч яшчэ і тым, што пераклаў на расейскую мову аповесць Змітрака Бядулі "Салавей" і зборнік апавяданняў Цішкі Гартнага "Трэскі на хвалях". Пасля смерці беларускага мовазнаўцы Эпімаха-Шыпілы Пушкарэвіч захоўваў яго асабісты архіў, які пасля быў перададзены ў Дзяржаўны архіў БССР. Памёр Канстанцін Пушкарэвіч у 1942 г.

А вось і галоўная падзея сённяшняга дня ў нашым календары...

3 лістапада 1882 г. у вёсцы Акінчыцы, што цяпер у межах Стоўпцаў, нарадзіўся **Кастусь Міцкевіч**, вядомы ва ўсім свеце як **Якуб Колас**, – народны паэт Беларусі, класік беларускай літаратуры, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і беларускай літаратурнай мовы, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Творчая спадчына геніяльнага паэта і празаіка стала нацыянальным набыткам беларусаў. Яго імя цяпер носяць Інстытут мовазнаўства беларускай Акадэміі Навук, нацыянальны драматычны тэатр у Віцебску,



прадпрыемствы, бібліятэкі, школы, плошчы і вуліцы ў многіх гарадах і населеных пунктах Беларусі. Працуюць літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа і яго філіялы. Помнікі класіку сёння ўсталяваныя ў Менску, Стоўпцах, Віцебску, Пінску, а таксама ў іншых гарадах Беларусі. А ў 1996 г. быў створаны Міжнародны фонд імя Якуба Коласа. Калі Вы любіце Беларусь, Вы проста не можаце не любіць Коласа...

## 6 ЛІСТАПАДА

6 лістапада 1862 г. памёр **Віктар Каліноўскі**, старэйшы брат Кастуся Каліноўскага, які шмат вывучаў гісторыю Беларусі і, верагодна, значна паўплываў на светапогляд Кастуся. На жаль, да паўстання Віктар не дажыў, бо памёр ад сухотаў у сямейным фальварку Якушоўка Ваўкавыскага павета. Было яму ўсяго 29 гадоў.

## 7 ЛІСТАПАДА

7 лістапада 1896 г. у мястэчку Рудзенск нара-дзіўся беларускі паэт **Міхась Чарот.** Сапраўднае ягонае прозвішча – Кудзелька. Гэта быў вельмі актыўны ў жыцці і творчасці чалавек. У школьную праграму Міхась Чарот увайшоў са сваёй паэмай "Босыя на вогнішчы", своеасаблівым беларускім перапевам паэмы расейскага паэта Аляксандра Блока "Дванаццаць". Некаторыя ўважаюць, што творца нават знешне быў падобны да Блока. Чарот шмат пісаў пра рэвалюцыю і камуністычную будучыню. Тады многія глядзелі на камунізм і на нацыянальнае адраджэнне як на адно цэлае. Таму не шкадавалі таленту, каб славіць рэвалюцыю, і часта выходзіла гэта ў іх вельмі паэтычна. Як, напрыклад, у Міхася Чарота, які ў запале камуністычнага хваласпеву імкнуўся адмовіць старую спадчыну свайго краю:

Дзевятнаццатай песняй прарочу
Беларусі лапцюжнай славу.
Беларусь болей слухаць не хоча
Пра Рагнеду і Ізяслава.

Але прайшоў час, і аказалася, што блытаць нацыянальны ўздым з камуністычнай дыктатурай было не варта. Памылка дорага каштавала тагачасным маладым гуманітарыям. І Міхась Чарот, афіцыйна прызнаны пачынальнікам беларускай савецкай літаратуры, у 1937 г. быў расстраляны тагачаснымі карнымі органамі як антысавецтчык.

## 8 ЛІСТАПАДА

8 лістапада 1883 г. прыйшоў на свет **Вацлаў Ластоўскі** – выбітны беларускі палітык, выдавец, а найперш гісторык і містыфікатар, а таксама паэт. ¨н пісаў:

Формаў трупехлых я вораг
дасконны,
сцежак стаптаных не зношу
ў тварэнні;
новым імкненням даць
новыя формы,
новыя словы і дум
выражэння
стаўлю я мэтай.

І гэта было праўдай. Калі пералічыць жыццёвы даробак Вацлава Ластоўскага, можна падумаць, што гэта не адзін чалавек працаваў, а цэлая Акадэмія Навук і Саюз пісьменнікаў разам узятыя. Ластоўскі – сапраўдная постаць Адраджэння. Мяркуйце самі: ён быў сакратаром рэдакцыі газеты "Наша Ніва", пасля – рэдактарам газеты "Гоман" і часопіса "Крывіч", выдаў "Кароткую гісторыю Беларусі", пісаў апавяданні і аповесці, апублікаваў "Падручны расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік" і фундаментальную "Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі"; шмат перакладаў. І пры гэтым усім узначальваў урад БНР, за што пры палякках трапіў у турму; працаваў у Міністэрстве беларускіх справаў міжваеннай Літвы, што знаходзілася ў Коўна. Адтуль перабраўся ў Менск, дзе быў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея. У 37-м савецкія карныя органы выслалі Ластоўскага ў Саратаў і там расстралялі. На той момант яму было 55 гадоў – як для гісторыка, дык самы росквіт. Можна сабе ўявіць, чаго не паспеў зрабіць Ластоўскі, чалавек-акадэмія, генератар ідэяў з неверагоднай працавітасцю.



## 13 ЛІСТАПАДА

Сёння адзначаецца **Міжнародны дзень сляпых.** Звязаная гэтая дата з днём нараджэння французскага педагога Валянціна Гаўі, які некалі заснаваў у Парыжы першы ў свеце інтэрнат для сляпых. У Беларусі пазбаўленыя зроку людзі працуюць на шматлікіх прадпрыемствах, маюць свае таварыствы і мастацкія калектывы. Чальцом Таварыства сляпых быў вядомы гісторык **Мікола Ермаловіч**. Ягоная апошняя кніга пра Вялікае Княства Літоўскае выйшла за грошы таварыства. Гэткім чынам сляпыя людзі даюць святло навукі людзям відушчым. Варта задумацца над гэтым хаця б сёння – у Міжнародны дзень сляпых.

13 лістапада 1730 г. нарадзіўся расейскі генералісімус **Аляксандар Сувораў**. Той самы, які праславіўся сваімі пераходамі цераз Альпы і дасягненнямі ў галіне вайсковай навукі. Той самы, што выступіў кіраўніком захопу і далучэння беларускіх земляў да Расейскае імперыі ў часе падзелу Рэчы Паспалітай. Найбуйнейшай перамогай Суворава ў той кампаніі стала бітва пад Сталавічамі каля Баранавічаў, дзе расейцы разбілі корпус Міхала Казіміра Агінскага. Калі ж у краі пачалося антырасейскае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, задушэннем вызваленчага войска зноў кіраваў Суворў. У бітвах 1794 г. на яго чале пад Крупчыцамі і Берасцем расейцы разбілі корпус генерала Серакоўскага. У гонар Суворава за савецкімі часамі ў Кобрыне быў адчынены ваенна-гістарычны музей, які датрываў да нашага часу. Кажуць, ёсць там і стэнды, прысвечаныя Касцюшку, а кожная экскурсія ператвараецца ў слоўную вайну. Музей Суворава ў Беларусі – такая самая недарэчнасць, як музей Гітлера, бо ў такім музеі ўшаноўваецца памяць акупанта.

13 лістапада 1915 г. ў Вільні адкрылася першая беларуская пачатковая школа. Адкрыла яе Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Маршалкам Таварыства быў **Вацлаў Іваноўскі**, а ягонымі намеснікамі – **Антон Луцкевіч** і **Вацлаў Ластоўскі.**

*Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына... (Я. Купала)*

# ПРЫГАДАЦЬ, ХТО МЫ

## 14 ЛІСТАПАДА

У беларускай вёсцы Крошын 14 лістапада 1812 г. нарадзіўся хлопчык, якога звалі **Паўлюк Багрым**. Гаротнае жыццё прыгоннага, рэкрутчына ў глыбіні Расеі – такі лёс напаткаў Паэта. Багрым варты гэтага звання, хоць вядома, што яго творчую спадчыну склалі толькі тры вучнёўскія сшыткі, якія зніклі без знаку пры арышце. Можа гэта былі вершы пра каханне, пра прыгажосць роднай зямлі. Захаваўся толькі адзін Багрымаў верш "Зайграй, зайграй, хлопча малы...", напісаны ім у 15-гадовым узросце. Верш гэты прысвечаны Крошынскаму паўстанню 1828 г. Думкі і пачуцці прыгоннага падлетка, скіраваныя ў бок пошукаў выйсця з безвыходнага становішча, вызначаюцца адчаем і бездапаможнасцю. Падлетак гатовы абярнуцца ў ваўкалаку, нарадзіцца каршуном — тады яго ў "паншчыну б не пагналі, у рэкруты б не забралі і ў маскалі не аддалі". Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, Багрым ужо не наважваўся брацца за пяро. ¨н працаваў у Крошыне кавалём. І адмысловым кавалём! Дасёння ў Крошынскім касцёле вісіць вялікая жырандоля, па-мастацку скаваная самім Паўлюком Багрымам. Верш і жырандоля – для некага можа і не значная, але такая вялікая і дарагая для шчырых беларусаў спадчына.

14 лістапада, толькі ўжо 1918 г., нарадзіўся яшчэ адзін хлопчык-беларус – **Паўлік Марозаў.** Як сведчыць гісторыя, Паўлік быў сапраўдным піянерам, бо выдаў ЧК свайго бацьку, старшыню калгаса, што, як мог, дапамагаў сваім аднавяскоўцам, якія не жадалі ўступаць у калгас і адпраўляцца на выгнанне. Бацьку, Трафіма Марозава, расстралялі, а Паўлікаў дзядуля забіў унучка-здрадніка. Доўгія гады савецкім дзецям прышчаплялі ідэал паводзінаў сапраўднага піянера Паўліка Марозава. Некаторым прышчапілі. Але, відаць, не ўсім. Былі і такія дзеці, якія болей любілі беларускія чытанкі, а не крываваы гісторыі пра класавую барацьбу. І такіх дзяцей заўсёды большасць, а значыць, усё ў нас будзе добра.

## 16 ЛІСТАПАДА

16 лістапада 1898 г. нарадзіўся **Вінцэнт Гадлеўскі** – вялікі чалавек, імя якога, як і многіх беларускіх несавецкіх дзеячоў, пры камуністах нідзе не гучала. Але гэта не адмяняе жыццёвага подзвігу ксяндза Гадлеўскага. Прыйшоў ён на гэты свет у мястэчку Поразава. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю і Пецярбургскую каталіцкую духоўную акадэмію. Адзін з першых пачаў служыць у касцёле па-беларуску. Пасля абвяшчэння БНР уваходзіў у склад яе Рады. Гадлеўскі – адзін з заснавальнікаў беларускай хрысціянскай дэмакратыі, рэдактар газеты "Крыніца". Калі Заходняя Беларусь апынулася ў складзе Польшчы, ксёндз Гадлеўскі выкладаў у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, быў пробашчам у Жодзішках (Свянцянскі павет). За беларушчыну палякі асудзілі яго на два гады турмы. Пазней, жывучы ў Вільні, Гадлеўскі пераклаў па-беларуску Новы запавет. Калі пачалася нямецкая акупацыя, ксёндз перабраўся ў Менск і стаў галоўным інспектарам школаў. ¨н імкнуўся выкарыстаць супрацоўніцтва з немцамі, каб захаваць у краіне беларускае школьніцтва. Але немцы хутка зразумелі, што Беларусь для яго важнейшая за Вялікую Германію. У 1942 г. яго арыштавалі і закатавалі. Лёс Гадлеўскага – яркі прыклад таго, што не ўсе, хто не сябраваў з камуністамі, былі абавязкова ворагамі свайго народу, як гэта ўбівалася ў галовы за савецкім часам.

## 17 ЛІСТАПАДА

Сёння ў свеце адзначаюць **Міжнародны дзень студэнтаў.** Устаноўлены ён быў у 1946 г. на Сусветным кангрэсе студэнтаў, што адбыўся тады ў Празе, ў гонар чэшскіх студэнтаў-патрыётаў, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі 17 лістапада 1939 г.

17 лістапада 1870 г. у мястэчку Хоцімск, што на Магілёўшчыне, нарадзіўся **Сяргей Блажко**, выдатны беларускі астрананом. ¨н быў членам-карэспандэнтам АН СССР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаным дзеячам навукі і тэхнікі СССР. Сяргей Блажко быў першым у свеце астраномам, які атрымаў і расшыфраваў спектр "знічкі" – метэора. ¨н жа стаў заснавальнікам новага спосабу фатаграфавання пераменных зорак, што прынесла астраному сусветную славу. З 1920 па 1931 гг. Блажко быў дырэктарам Маскоўскай абсерваторыі. За дзесяткі гадоў, аддадзеных навуцы, ён дэталёва даследаваў больш як дзве сотні пераменных зорак розных тыпаў. Цікава, што для сваіх даследаванняў навуковец ужываў прыборы, створаныя ўласнымі рукамі. Больш за 20 гадоў Блажко ачольваў Камісію па вывучэнні пераменных зорак пры Астранамічным савеце Акадэміі Навук СССР. ¨н жа быў аўтарам класічных падручнікаў па астраноміі. Імем Сяргея Блажко названая гара-кратэр у паўночным паўшар`і Месяца. На Беларусі пра свайго астранома, на жаль, наўрад ці хто сёння згадае.

У гэты дзень 1938 г. нарадзіўся **Вадзім Сукманаў**, беларускі кінарэжысёр. З 1968 г. ён працаваў на кінастудыі "Беларусьфільм". Вадзім Сукманаў быў лаўрэатам шматлікіх міжнародных прэміяў, атрымліваў прызы ў Лондане, Будапешце, Маскве, Жэневе. Мала хто ведае, што гэты кінарэжысёр-дакументаліст быў і тонкім мастаком-акварэлістам. Ягоны ўнёсак у беларускую культуру вялізны. Варта толькі згадаць ягоныя фільмы, прысвечаныя Коласу, Быкаву, Барадуліну, Маўру... Нічога лепшага дасёння гэтак і не зроблена.

## 19 ЛІСТАПАДА

Сёння ў свеце адзачаюць вельмі сімпатычнае свята – **Міжнародны дзень вітанняў.** Давайце і мы сёння (і заўсёды) не будзем шкадаваць вітанняў адзін аднаму. Сапраўды, нішто не каштуе нам гэтак танна і нішто не цэніцца гэтак дорага, як узаемаветлівасць.

## 20 ЛІСТАПАДА

20 лістапада 1899 г. нарадзіўся **Міхась Клімковіч**, вядомы тым, што напісаў словы гімна БССР, а таксама тым, што ў другой палове 30-х узначальваў Саюз пісьменнікаў БССР, акурат тады, калі была расстраляная ці высланая ў ГУЛАГ большасць беларускіх літаратараў. Клімковіч адкрыта спрычыняўся да гэтых рэпрэсіяў: пісаў "зубадрабільныя" артыкулы, у якіх звінавачваў сваіх калег у нацдэмаўшчыне.



20 лістапада 1930 г. спрабуе скончыць жыццё самагубствам **Янка Купала**. Да гэтага прывялі напады на яго ў друку і допыты ў ГПУ. А найперш, мусіць, тая атмасфера савецкага «шчасця», у якой даўнія сябры і калегі паэта пачалі знікаць сярод ночы. Купалу змушалі сядзець у прэзідыумах і хваліць Сталіна, тады як у краіне былі разгорнутыя масавыя рэпрэсіі. Яшчэ і дагэтуль невядомая прычына смерці паэта ў 1942-м, калі ён упаў у лесвічны пралёт маскоўскага гатэлю. Адна з версіяў кажа, што Купала ўсё ж здзейсніў свой намер самавольна пакінуць жыццё. Аднак пытанне наконт Купалавай смерці і да сёння застаецца адкрытым.

## 26 ЛІСТАПАДА



У гэты дзень, 26 лістапада1930 г. у Воршы нарадзіўся **Уладзімір Караткевіч**, выдатны беларускі празаік і паэт. ¨н, як ніхто іншы, змяніў у ХХ стагоддзі светапогляд беларусаў. Ягоныя кнігі, кінасцэнары і п'есы сталі падмуркам найноўшага беларускага Адраджэння. Трапна і па-мастацку прыгожа сказаў пра творцу Рыгор Барадулін: "Любая літаратура можа сказаць, што яна багатая і сталая, калі мае свайго Уладзіміра Караткевіча. Ты пісаў як дыхаў. Сваім асабістым прыкладам творцы паказваў узор служэння Радзіме, Народу, Мове. Далёкі ад марнай сумятні, ад дробязных страсцей, з кнігай і шчодрым сэрцам прыйшоў Ты на свет, каб пакінуць свету кнігі свае па-беларуску шчырыя і па-караткевічаўску рамантычна-незамутненыя, ранішнія. Кнігі Твае чыталіся, чытаюцца і будуць чытацца, бо яны напісаныя як бы навырост. Тыя, хто прыйдуць на зямлю ўслед за намі, будуць зайздросціць нам як Тваім сучаснікам, Тваім першачытачам... Праўдзівы Майстра, чысты як сляза, Паэце, Ты ёсць, Ты будзеш! Вечна. Крынічна. Зорна.".

## 28 ЛІСТАПАДА

28 лістапада 1923 г. было створана літаратурнае аб"яднанне "**Маладняк**". Узнікненне гэтай арганізацыі стала яшчэ адным доказам таго, што беларусы – нацыя паэтаў. Філіі "Маладняка" існавалі па ўсёй Беларусі, а таксама ў Латвіі, Расеі і Чэхіі. Ініцыятарамі стварэння аб"яднання выступілі Міхась Чарот, Анатоль Вольны, Алесь Дудар, Андрэй Александровіч, Адам Бабарэка і Язэп Пушча. На хвалі афіцыйнай савецкай беларусізацыі вясковыя хлопцы, якія імкнуліся спрычыніцца да паэзіі, спрычыняліся адначасова і да камунізму. Адраджэнне нацыі і нараджэнне новага соцыуму, патрэбнага ўладзе, спляталіся ва ўяўленнях маладнякоўцаў, і яны не зважалі на тое, што змешваюць незмяшальнае. Багатая і спрадвечная традыцыя не магла не ўступіць у канфлікт з маладой і драпежнай савецкай ідэалогіяй. Яны яшчэ спрабавалі выракацца Рагнеды і Ізяслава, скідаць старых паэтаў з карабля гісторыі, але самі былі асуджаныя: як паэтам-адраджэнцам ім не прадугледжвалася месца на тым караблі. Таму напрыканцы 30-х з паэтаў-маладнякоўцаў у жывых засталіся адзінкі. Астатнія былі брутальна расстраляныя або загнаныя ў сталінскія лагеры.

**Гістарычны сектар**

# ЯЗЭП СТАБРОЎСКІ, ВЫБІТНЫ АРХЕОЛАГ



2 ЛІСТАПАДА 1869 ГОДА Ў СЛОНІМЕ НАРАДЗІЎСЯ ЯЗЭП СТАБРОЎСКІ, ВЫБІТНЫ АРХЕОЛАГ, КРАЯЗНАЎЦА, ФІЛОСАФ, ВЫНАХОДНІК, ЗАСНАВАЛЬНІК АДНАГО СА СТАРЭЙШЫХ НА БЕЛАРУСІ СЛОНІМСКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ.

Пачаў ён сваю кар'еру як вайсковец. Першую сусветную вайну Язэп Стаброўскі закончыў у чыне палкоўніка. Але з цягам часу навуковыя інтарэсы ўзялі верх над прафесійна-ваеннымі, хоць Язэп Язэпавіч, як расказваюць блізкія яму людзі, да канца дзён не здымаў шыняля. У 1921 годзе Язэп Стаброўскі вяртаецца на родную Слонімшчыну і ўсе свае сілы і веды аддае даследаванню роднага краю. ¨н збірае ўсё, што, на яго погляд, уяўляе гістарычную каштоўнасць. У калекцыі Стаброўскага меліся такія экспанаты, якія маглі б упрыгожыць стэнды і залы найлепшых музеяў Еўропы: багатая калекцыя крамянёвых і каменных вырабаў часоў мезаліту і неаліту, галава старажытнаславянскага ідала, аўтографы Карамзіна, Дзяржавіна, Льва Талстога, два лісты Пушкіна да яго жонкі Наталлі Ганчаровай, гістарычныя рукапісы XVI — XVII стагоддзяў, іншыя рарытэты. А што датычыць, напрыклад, каменнага ідала, дык пра яго Стаброўскі напісаў нават даследчы артыкул і змясціў у красавіцкім нумары часопіса "Беларусь" за 1946 год. Пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Стаброўскі зноў пачаў збіраць калекцыі, прыводзіць у належны стан рукапісы, кнігі, фатаграфіі і займацца абсталяваннем музейных пакояў…I кожны, хто яго ведаў, здзіўляўся працаздольнасці і настойлівасці гэтага чалавека, якому ўжо тады йшоў восьмы дзесятак.

Язэп Стаброўскі быў не толькі археолагам, але і таленавітым гісторыкам і вынаходнікам. Ім даследавана больш за 150 (!) курганоў на Гарадзеншчыне, напісаныя і надрукаваныя дзесяткі артыкулаў па краязнаўстве і гісторыі. Дарэчы, першы яго артыкул быў надрукаваны ажно у 1899г. у сакавіцкім нумары часопіса "Исторический Вестник". Праца мела назву "К вопросу об ископаемых стеклянных ша-рах". На роднай Слонімшчыне Язэп Стаброўскі на 99-м годзе жыцця памёр ў галечы, забыты мясцовымі ўладамі. Хоць ніколі яго не забываў КДБ, пад наглядам якога выбітны патрыёт пражыў усе пасляваенныя гады...

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# NAD SMILE. ИСТОРИЯ И ЖИЗНЬ

НОЯБРЬ ПРОЩАЛСЯ ХОЛОДНЫМ ВЕТРОМ И БЕЛЫМ СНЕГОМ. НАСТАЛА ЗИМА, ПОЭТОМУ ПОРА ОКОНЧАТЕЛЬНО ЗАБЫТЬ ПРО СВОИ НЕДОСТАТОЧНО ТЕПЛЫЕ КОСОВОРОТЫ. А ВОТ 21 НОЯБРЯ БОЛЬШОЕ СКОПЛЕНИЕ ЭТИХ КОЖАНЫХ КУРТОК МОЖНО БЫЛО НАБЛЮДАТЬ ОКОЛО ДИСКО-КЛУБА ПАРКА КУЛЬТУРЫ И ОТДЫХА. NAD SMILE ПРЕДСТАВЛЯЛ СВОЙ АЛЬБОМ «HARD DRINKS». ДЕЛОМ ДОЛГА СТАЛО РАЗУЗНАТЬ ПРО ДАВНО ПОЛЮБИВШУЮСЯ ПУБЛИКЕ ГРУППУ.

Как оказалось, история молодого, на первый взгляд, коллектива NAD SMILE началась осенью далекого 1996 года. Именно тогда два друга (Игорь Шапран, который сейчас выполняет роль гитариста и вокалиста, Паша Власюк - ударник) решили создать свою группу. Как и многие в то время, Игорь воспитывался на музыке NIRVANA. Не трудно догадаться, что играли ребята первоначально гранж.

В этом направлении музыки группа творила около 3-х лет. За это время менялось название, точки репетиций и большое количество бас-гитаристов. Объяснить это можно было тем, что не каждый басист уживался со своеобразной атмосферой веселья и постоянных приколов внутри группы. Стоит упомянуть Славу Мясникова, полуторагодовая деятельность в группе которого прервалась только из-за его переезда в Минск. Но потом в группу пришел басист, который смог превзойти всех бывших вместе взятых.

До этого он уже успел отметиться в группе DESTROY и играл достаточно хорошо. Его зовут Максим Тараданов. Он все время улыбался и «мочил» такие же приколы, как и сами смайловцы. Слушал он то же самое что и они - BLINK 182, NOFX, SUM 41. И тут то все завертелось, закружилось. Сразу группа поменяла направление в музыке. С достаточно грустного и наводящего зеленую тоску grunge, перешли на оригинальный быстрый и веселый калифорнийский панк-рок (просьба не путать с русским панком в духе PURGEN). Больше половины песен были просто-напросто выброшены из репертуара, а те, что остались, были переделаны и вошли в первую демо-запись, которая была сделана в Высоком.



В нее вошли всего 8 песен. После этого пошел ряд концертов: Лыщицы, Оранчицы, Береза, выступление в Брестском политехническом техникуме с ОНЕГИНым, концерт, посвященный памяти Курта Кобейна в ДК ЖД, фестиваль «Алюминиевая зима», фестиваль в брестском рок-клубе, просто концерты в рок-клубе и др.

Тексты сочиняют и поют как Максим, так и Игорь. Главного в группе нет. Через 2 года был записан их первый альбом под названием «Hard Drinks».

Музыка NAD SMILE ни к чему не призывает и никого не оскорбляет. Тексты самые разные: история про парня с велосипедом (Мой велосипед), про парня который не хотел ходить в школу («Школа»), про любовь («Нет места», «Утром проснуться»), песня посвещенная их другу, покончившему жизнь самоубийством, спрыгнув с крыши у них на глазах («Со мной»).

**Денис ДЕНИСОВ**

# «СТАРИЧОК С ГРИБАМИ» ОСТАЛСЯ В БРЕСТЕ!

6 ДЕКАБРЯ В БРЕСТЕ ТАМОЖЕННИКИ ПРЕДОТВРАТИЛИ ВЫВОЗ ЗА РУБЕЖ ПАРТИИ СТАРИННЫХ ИКОН И СУВЕНИРОВ.

Как сообщили БЕЛТА в Государственном таможенном комитете, контрабандный товар обнаружен в межпотолочном пространстве вагона поезда Москва — Варшава.

Сотрудники таможни извлекли из тайника 18 икон и складень XVIII и XIX веков. Среди них — иконы «Рождество Иоанна Предтечи», «Богоматерь Казанская», «Никола Можайский» и другие. Кроме культовых задержано несколько ценных предметов производства Фаберже: статуэтка «Старичок с грибами», «Матрешка», покрытая золотом, а также пасхальное яйцо, покрытое серебром и позолотой с семью драгоценными камнями.

По предварительной оценке, стоимость изъятого составляет около 25 миллионов рублей.

**Максим СЕЛЯГИН**

# А ЗА КАРДОНОМ...

ЖИТЕЛЬ ВОЛКОВЫСКА ПЕТР АКУЛИК ВЫШЕЛ ПОБЕДИТЕЛЕМ ОБЩЕПОЛЬСКОГО КОНКУРСА БЕЛОРУССКОЙ ПОЭЗИИ И ПРОЗЫ, ИТОГИ КОТОРОГО ПОДВЕДЕНЫ В БЕЛОСТОКЕ.

Подборка его произведений признана лучшей в группе работ среди взрослых и лицеистов. По решению жюри все они будут опубликованы на страницах еженедельника «Ніва» — газеты белорусов, которые проживают в Польше.

Петр Акулик работает преподавателем Субочской средней школы Волковысского района. Благодаря творческому отношению к делу его уроки труда, особенно по обработке дерева, стали для учащихся любимым занятием. В свободное время он готовит публикации, в том числе литературного направления, для средств массовой информации, в частности, для издающейся в Волковыске «Местной газеты».

**Максим СЕЛЯГИН**

# ЖЫЦЬ - ЗНАЧЫЦЬ ПОМНІЦЬ

ГІСТОРЫЯ – САМАЯ СКЛАДАНАЯ І СУПЯРЭЧЛІВАЯ НАВУКА. ТЫМ БОЛЬШ ГІСТОРЫЯ ТАГО НАРОДУ, ДЛЯ ЯКОГА ЯЕ ПЕРАПІСВАЛІ, КОЖНЫ НА СВОЙ ГУСТ, НЕ АДЗІН РАЗ. ШТОСЬЦІ НЕІСНАВАЎШАЕ ВЫДАВАЛІ ЗА ПРАЎДУ, ШТОСЬЦІ ЎЗНОСІЛІ, ПЕРАБОЛЬШВАЛІ. ІНШАЕ – ПРЫМУШАЛІ ЗАБЫЦЬ. ШМАТЛІКІЯ ПРЫКЛАДЫ ГЭТКАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НЕСПРАВЯДЛІВАСЦІ МОЖНА ПЕРАЛІЧАЦЬ БЯСКОНЦА, ЯК І ПРЫКЛАДЫ ЯЕ ПРАМОГА СЛЕДСТВА, – НАШАЕ АБЫЯКАВАЕ, А , ЧАСАМ, НЕДАРАВАЛЬНА НЕПРЫЯЗНАЕ (З-ЗА НЯВЕДАННЯ) СТАЎЛЕННЕ ДА НЕКАТОРЫХ ЭПІЗОДАЎ ГІСТОРЫІ І ДА ЎСЯГО, ШТО НАГАДВАЕ НАМ ПРА ІХ. І ШТО САМАЕ ГОРШАЕ – МЫ НЕ СПРАБУЕМ НАВАТ РАЗАБРАЦЦА Ў ІХ СУТНАСЦІ, ВЫЛУЧЫЦЬ СВАЁ СТАЎЛЕННЕ, ПРОСТА ВЕДАЦЬ АБ'ЕКТЫЎНЫ ХОД ПАДЗЕЙ. ЗРАЗУМЕЛА, ЖЫЦЬ БЕЗ ПАМЯЦІ ПРАСЦЕЙ.

Але слова без пэўнай літары – гэта не больш чым бессэнсоўны набор пісьмовых сімвалаў. Таксама і гісторыя без нейкай яе часткі. Забыць памылкі, зробленыя тымі, хто быў да нас, – значыць паўтарыць іх зноў. Забыць іх славу – пазбавіцца яе. Не думаць пра мінулае, – згубіць сувязь з продкамі, – а гэта ўсё адно, што змярцвець душою.

Я не бяруся судзіць аб тым, якую ролю адыграў для Беларусі Слуцкі Збройны Чын і паход войска С. Булак-Балаховіча і нават не стану распавядаць Вам аб тых падзеях, бо гэта ўжо было зроблена да мяне. Проста хачу парадавацца таму, што ёсць яшчэ людзі, якія шануюць нашую мінуўшчыну і робяць усё дзеля таго, каб і ў нашых душах жыла памяць.

Хто не жыве ў раёне мясакамбіната, наўрад ці ўвогуле ведае, што там месцяцца вайсковыя могілкі. А большасць з тых, хто хоць нешта чуў пра іх, трывала называюць іх польскімі. Так, сапраўды, у часы не самых лепшых адносінаў улады (зразумела, савецкай) да нашай гісторыі гэты помнік гісторыка-культурнай спадчыны ад поўнага знішчэння ўратавала польская дзяржава, узяўшы пад сваю апеку яшчэ не зруйнаваную частку могілак. І нікога не крануў тады той факт, што частка надмагільных надпісаў, (хай лацінскімі літарамі, але па-беларуску) сведчыла аб тым, што тут знайшлі спакой беларускія жаўнеры войска С. Булак-Балаховіча. Ды й пра нацыянальнасць іншых наўрад ці можна заяўляць адназначна.



Тут спачываюць беларускія жаўнеры войска генерала С.Булак-Балаховіча

Усе магілы невядомых кажуць нам толькі да прыналежнасці жаўнера да польскай арміі, да якой належалі і добраахвотна перайшоўшыя на іхні бок беларускія вайсковыя фарміраванні, што тады налічвалі звыш 700 чалавек і мелі месцам сваёй дыслакацыі Берасцейскую крэпасць як раз у гады заснавання гэтых могілак. Мяркуецца, што іх хавалі як польскіх жаўнераў, акрамя тых, хто належаў да т.зв. Балахоўскай сотні – людзей адмысловага вайсковага гарту і аддасці Радзіме, якія прысягалі на вернасць толькі Беларусі і падпарадкоўваліся толькі свайму камандзіру.



Ген. Станіслаў Булак-Балаховіч (сядзіць пасярэдзіне) са сваім штабам

Ды, не зважаючы на ўсё гэта, палякамі на месцы іх пахавання была усталявана мемарыяльная дошка, што абвяшчала аб спачываючых у гэтай зямлі выключна польскіх жаўнерах. Гэта, канешне, лепш за поўнае знішчэнне гэтых могілак, але таксама абражала беларускую годнасць.

Але нарэшце гэтая несправядлівасць была выпраўлена. У канцы лістапада групай берасцейскіх патрыётаў быў усталяваны адпаведны помнік беларускім змагарам за Бацькаўшчыну. А 1 снежня адбылося яго ўрачыстае адкрыццё і асвячэнне.

Нягледзячы на неспрыяльнае надвор"е, гэтая акцыя сабрала каля 20 удзельнікаў. На ёй гучалі натхняльныя прамовы, распавядалася пра падзеі тых часоў, чыталіся вершы, прысвечаныя гэтай тэме, грэка-каталіцкім (вуніяцкім) святаром была прачытана літургія па загінуўшых.

З усіх шчырых слоў, сказаных у той дзень, найбольш запомнілася адна выснова: гэта патрэбна не ім, гэта патрэбна нам. Трэба помніць усіх іх, каб жыць, і, можа, каб помнілі нас.

На жаль, нас не вучылі шанаваць святасць мінуўшчыны. Рабіць гэта нам падказвае сэрца. А яно, як вядома, не ўмее хлусіць...

**В.К.(Наш СвоД)**

# МАСЯНЯ РАСКАЖЕТ МОЛОДЕЖИ О СПИДЕ

Масяня, ставшая настоящей культовой мультипликационной героиней стран ближнего зарубежья, внесет свой героический вклад в актуализацию проблемы СПИДа. Этим же она поможет Красному Кресту сделать информацию о СПИДе более доступной для понимания подростками и молодежью. Об этом сообщил на пресс-конференции, посвященной Всемирному дню борьбы со СПИДом, автор и создатель мультфильмов Олег Куваев. По его словам, Масяня принимает прямое участие в программе Российского Красного Креста (РКК) «Молодежь и СПИД: равный обучает равного», чтобы повысить информированность молодежи по проблемам ВИЧ-инфекции. Он полагает, что «молодежная аудитория по-другому воспринимает информацию, которая преподносится в качестве профилактики медиками». Такие попытки обезопасить молодежь от СПИДа, по его мнению, напоминают «декорации в поликлинике», сообщает РИА "Новости".



«С психологической точки зрения они воспринимаются с трудом», - считает Куваев. В этой связи создатель Масяни дал согласие на использование ее образа в информационно-образовательном буклете РКК по проблеме СПИДа. При этом он добавил, что «сотрудничество Масяни с Красным Крестом только началось». Будем надеяться, что Масяня к тому же станет и культовым борцом со страшной прогрессирующей болезнью.

**Макс СЕЛЯГИН**

## ДАРЭЧЫ

Мужык прыходзіць дадому стомлены пасля працы і чуе за сценкай характэрныя ўздыхі і охі. Тады ён кажа сыну:

- Гэты сусед мяне ўжо дастаў! Пайду скажу яму, каб ён цішэй кахаў сваіх "сябровак"!

- Мама ўжо збіралася яму гэта сказаць.

- Праўда? І што, так і не сказала?

- Не ведаю, яна яшчэ ад яго не вярнулася...

***

- Дзяўчына, Вы былі ўжо запрошаныя на наступны танец?

- Не, я яшчэ вольная!

Тады патрымайце, калі ласка, маё піва.

***

Сэкс-сімвал - гэта чалавек, які можа заняцца сэксам - але чыста сімвалічна.

***

- Ты ў мяне такі няўважлівы, тата.

- Ага. Калі б я быў больш уважлівы, цябе б увогуле не было.

*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! (Ф. Багушэвіч)*

# КУЛЬТ ШАНАВАННЯ ПРОДКАЎ

У ПАПЯРЭДНІМ НУМАРЫ МЫ ПАЗНАЁМІЛІ ВАС З АСНОВАЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА, РАЗГЛЯДЗЕЎШЫ 4 АСНОЎНЫЯ СВЯТЫ БЕЛАРУСАЎ У ГАДАВЫМ ЦЫКЛЕ. ГЭТА СУАДНОСІНЫ МІЖ САБОЙ ПА ВЕДЫЙСКІМ (ПАГАНСКІМ) І ХРЫСЦІЯНСКІМ КУЛЬЦЕ ЗНАКАВЫЯ ДАТЫ: КАЛЯДЫ–РАСТВО ХРЫСТОВА, ВЯЛІКДЗЕНЬ–ПАСХА, КУПАЛЛЕ–ДЗЕНЬ ІВАНА КРЫСЦІЦЕЛЯ, І БАГАЧ–РАСТВО БАГАРОДЗІЦЫ. АЛЕ ПАКУЛЬ НЕ ЗВЯРНУЛІ ЎВАГУ НА НЕКАТОРЫЯ ІНШЫЯ, ДАВОЛІ ЗНАЧНЫЯ МОМАНТЫ ТРАДЫЦЫЙНА АБРАДАВАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСАЎ.

Гаворка ідзе пра культ шанавання продкаў. Раней згадваліся святы, што тычыліся менавіта "света жывых". Але нашыя продкі ніколі не забывалі і пра тых, хто ўжо пакінуў гэты свет.

Асноўнымі днямі памінання продкаў лічацца веснавая Радаўніца і Восеньскія Дзяды. Калі быць больш дакладнымі, то неабходна адзначыць, што дзён ушанавання памёрлых было значна больш – сярод іх суботы перад Масленіцай і Троіцай, 1-ая, 2-ая, і 3-ая суботы Вялікага посту. Калі уважліва прасачыць гэтыя дні на календары, можна заўважыць, што сфера між німі ахоплівае час правядзення асноўных земляробчых работ. Такім чынам, можна сцвярджаць, што для правядзення сельскагаспадарчага цыклу нашыя продкі заручаліся падтрымкай не толькі сіл прыроды.

Гэта яскрава выражае стаўленне іх да сваіх папярэднікаў на гэтай зямлі. Іх шанавалі нікольні не менш за астатніх, згодна з уяўленнямі аб вышэйшых сілах, уважаючы продкаў дабрадзеямі. Гэты прынцып можна выразіць у пэўным табу, што рэгламентуе паводзіны ўдзельнікаў у кожнай з абрадавых сітуацый: перш чым сабе – продкам. Першы блін, спечаны на любое свята, клалі ў чырвоны кут, пад ікону, – для мёртвых; першую чарку на памінаннях – таксама; маладыя, перш чым вянчацца, наведвалі магілы бацькоў, і, мабыць, галоўнае: з пачаткам веснавых земляробчых работ, перш чым узяцца за саху, абавязкова трэба было навесці парадак на магілах сваякоў.

Гэта, дарэчы, поўнасцю адпавядала і існаваўшым прынцыпам сямейнай іерархіі, што грунтавалася на ўзроставай аснове: старэйшы - галоўнейшы. А тым больш, што памерлых надзялялі магчлівасцю адмыслова ўздзейнічаць на людзей і тое, што адбываецца навокал. Іх прасілі аб дапамозе і баяліся раззлаваць. Гэта – адна з асноў фарміравання абрадавага комплекса беларусаў.

Але апошні ўтрымліваў не толькі культ шанавання продкаў. Яшчэ адзін з найважнейшых пунктаў у ім прысвечаны абрадам, звязаным з захаваннем і працягам свайго роду. І асноўная падзея для чалавека ў гэтым плане, без сумневу, – вяселле і радзіны.

Для вяселля ў народным календары існуюць перыяды як найбольш спрыяльныя, так і перыяды, калі спраўляць іх катэгарычна забараняецца. Пачнем з часу найбольш спрыяльнага, вызначанага летняй актыўнасцю працы і сістэмай працяглых пастоў. Гэта найперш Вялікая вясельніца, якая працягвалася ад Пакроваў (14.10), а месцамі нават ад Багача (21.09) і да Піліпаўскага посту (27.11). Пасля гэтага пачынаўся забаронны час – Піліпаўскі пост, што доўжыўся да Раства Хрыстова (6.01 уключна). Пасля калядных святкаванняў, а дакладней, пасля Вадохрышча, пачыналіся т. зв. Мясаедныя вяселлі, якія цягнуліся да Масленіцы, што распачынала самы строгі Вялікі пост (ягоны пачатак не мае пэўнай даты).

Менавіта мясаедны перыяд лічыўся самым удалым. Гэта не цяжка растлумачыць: падчас цяжарнасці маці атрымлівала самае энэргаёмістае бялковае сілкаванне, а дзіцё нараджалася ў час, калі прырода шчодра адорвала чалавека неабмежаваным багаццем вітамінаў.

Але існаваў і яшчэ адзін перыяд, найменш спрыяльны, – Траецкія вяселлі. Яны пачыналіся ад Троіцы і абрываліся Пятроўскім пастом, які доўжыўся да 12.07. Пасля маецца яшчэ адін, самы малапрацяжны, Спасаўскі пост (14-28.08).



Беларускае вяселле пачатку XXст.

Такім чынам, мы коратка распавялі пра пабудову Беларускага народнага календара. Але нашыя пазнанні аб Беларускай абрадавай культуры на гэтым не заканчваюцца. Беларуская традыцыйная спадчына яшчэ хавае ў сабе шмат таямніц, якія мы абавязкова яшчэ зможам пазнаць.

**В.К.(Наш СвоД)**

# НАМАТАЙ САБЕ НА ВУС

СВАЯКОЎ НЕ ВЫБІРАЮЦЬ. ХВАРОБУ ТАКСАМА. КАЛІ Ў ДНІ ДАЛЁКАГА ЮНАЦТВА НАШЫХ БАЦЬКОЎ ПРЫГОЖАЯ ПАЛОВА ЧАЛАВЕЦТВА, УСТУПАЮЧЫ Ў ІНТЫМНЫЯ ЗНОСІНЫ З ПАЛОВАЙ МОЦНАЙ, НЕПАКОІЛАСЯ Ў АСНОЎНЫМ ПРА ТОЕ, ЯК БЫ НЕ ЗАЦЯЖАРЫЦЬ, ТО ПЕРАД НАМІ СТАІЦЬ ПЫТАННЕ: "ЯК НЕ ЗАХВАРЭЦЬ НА СНІД?".




Фота: IREX/ProMedia

На 1 лістапада 2002 г. у рэспубліцы зарэгістравана **4667** выпадкаў ВІЧ.

У РБ **85%** ВІЧ-інфіцыраваных ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў.

У свеце кожную хвіліну заражаецца ВІЧ **50 чалавек.**

Паводле рэспубліканскай статыстыкі на 1 лістапада 1998 г. колькасць ВІЧ-інфіцыраваных склала **2257 чалавек**, на 1 лістапада 2001 г. іх налічвалася **3828**, а на 1 лістапада 2002 г. – **4667**.

Калі аналізаваць статыстыку па вобласцях, то на першае месца па колькасці інфіцыраваных выходзіць Гомельская вобл. (2950 чал.), за ёй асобна ідзе г. Менск (654 чал.), далей – Менская вобл. (321 чал.). На чацвёртым месцы знаходзіцца, як ні прыкра, Берасцейская вобл. (226 чал.).

У нашай вобласці "лідзіруе" г.Пінск (112 чал.), затым ідзе г. Баранавічы (33 чал.), далей – Берасце (31 чал.).

Многія навукоўцы спрабуюць вынайсці лек, які ўраз вырашыць праблему ўсяго чалавецтва. Што ж, будзем спадзявацца на лепшае. Але кожны чалавек, незалежна ад палавой прыналежнасці, нацыянальнасці, веравызнання павінен разумець, што ў барацьбе са СНІДам можна дабіцца многага. У выніку прафілактычнай працы можна выратаваць шмат жыццяў.

Цяжка і немагчыма выратаваць усё чалавецтва, але пачаць заўсёды можна – з сябе, са сваіх блізкіх і каханых людзей.

**Алена КІРЫЧУК**

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці. Тэл. (0162) 22-90-97.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 22-90-97.**




АБ'ЯВЫ

# ЛЕТНІ ІНСТЫТУТ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ ПЕНСІЛЬВАНІІ

У ЧЭРВЕНІ-ЖНІЎНІ 2003 Г. THE SOLOMON ASCH CENTER FOR STUDY OF ETHNOPOLITICAL CONFLICT (ПЕНСІЛЬВАНІЯ, ЗША) ЛАДЗІЦЬ ДЗЕСЯЦІТЫДНЁВЫ ЛЕТНІ ІНСТЫТУТ.

Мэта яго правядзення - абмен досведам паміж навукоўцамі і практыкамі сацыяльных навук, разгляд пытанняў паходжання і наступстваў этнапалітычных канфліктаў і інш.

Для ўдзелу ў праграме неабходна мець ступень доктара, кандыдата навук альбо магістра па спецыяльнасці, блізкай да тэматыкі канферэнцыі; мець значны досвед працы.

Арганізатары кампенсуюць выдаткі на праезд і пражыванне, забяспечваюць стыпендыяй.

Тэрмін падачы заяваў - да 1 лютага 2003 г.

Дадатковая інфармацыя: http://www.psych.upenn.edu/sacsec Roy J. Eidelson, Ph.D., The Solomon Asch Center for Study of Ethnopolitical Conflict, e-mail: royeidel@psych.upenn.edu.

**Dzedzich week-news**

# ФІНАНСАВАЯ ПАДТРЫМКА АРГАНІЗАЦЫЙ І АСОБ АД THE ECHOING GREEN

Фінансавая падтрымка арганізацый і асоб ад The Echoing Green The Echoing Green Fellowship Program выдзяляе стыпендыі і рэсурсы асобам ад 18 год і арганізацыям для рэалізацыі праектаў, звязаных з грамадскай адукацыяй, аховай навакольнага асяроддзя, мастацтвам, аховай здароўя, паслугамі для моладзі, грамадскім і эканамічным развіццём і абаронай грамадзянскіх правоў.

Стыпендыятам можа быць выдзеленая фінансавая падтрымка ў памеры да $60000 на два гады на тэхнічную дапамогу ў рэалізацыі праекта.

Заявы неабхода падаць да 6 лютага 2003 г.

Дадатковая інфармацыя: http://www.echoinggreen.org/index.htm?id=12.

**Dzedzich week-news**

# МІЖНАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ МАДЭЛЯВАННЯ ПАЛІТЫКІ Ў СТАМБУЛЕ

У Стамбуле (Турцыя) 2- 3 чэрвеня 2003 года пройдзе Міжнародная канферэнцыя мадэлявання палітыкі. Мэта канферэнцыі - спрыяць абмену досведам паміж эканамістамі, якія праводзяць колькасны аналіз палітыкі і прыняцця рашэнняў у грамадскім і прыватным сектары.

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна да 15 снежня 2002 г. падаць тэзісы свайго выступлення. Дадатковая інфармацыя і кантакты: Prof. Ali H. Bayar Free University of Brussels.

Тэл: +32-2-650 4115.

E-mail: Ali.Bayar@ecomod.net

Internet: http://www.ecomod.net/conferences/ecomod2003/ecomod2003.htm.

**Dzedzich week-news**



Дарагую

**АЛЕНУ КУДРАЎЦАВУ**

сардэчна віншуем з **Днём нараджэння!**

Жадаем здароўя, аптымізму, поспехаў!

**Б/П, філфак**



Цудоўных, вясёлых і прыгожых дзяўчат

**ЮЛІЮ МАРЭЦКУЮ**
**ІРЫНУ МАРЫЙКА**

сардэчна віншуем з **Днём нараджэння!**

Шчасця, кахання, усялякіх поспехаў і добрых сяброў.

Дзякуючы Вам, нашае жыццё становіцца больш цікавым і поўным!

**Вашыя сябры, юрыдычны факультэт**

*АБ'ЕКТЫЎНА ПРА РЭАЛЬНАЕ*

**RR**

**РАДЫЁ РАЦЫЯ**

***НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ***

*6035 кГц (49 м) 08:00-10:00*

*6180 кГц (49 м) 13:00-15:00*

*6050 кГц (49 м) 21:00-23:00*

***НА СЯРЭДНІХ ХВАЛЯХ***

*612 кГц (490 м) 07:00-11:00*

**WWW.RACYJA.PL**

Берасцейскае абласное аддзяленне
**Грамадскага аб'яднання**
**ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР**
**«ВЯСНА»**

прапануе грамадзянам бясплатную прававую дапамогу.

(адміністратыўнае і грамадзянскае права, парушэнні правоў чалавека)

**Звяртайцеся на адрас:** г. Берасце, бульвар Шаўчэнкі, д. 7, кв. 24.
Тэл./факс: (0162) 20-13-95.

**БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІЧКА ЗАПРАШАЕ**

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

**ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!**

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв.2.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго: ____________________

**УВАГА!**

Працягваецца бясплатная падпіска

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч".**

Калі ты жадаеш атрымоўваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв. 2.**

Чаму ты вырашыў падпісацца: ____________________

Прозвішча: ____________________

Імя: ____________________

Імя па бацьку: ____________________

Паштовы адрас: ____________________

# А ВОКРУГ – ТИШЬ ДА ГЛАДЬ

В СЕРЕДИНЕ АВГУСТА НА ГАЗЕТНЫХ ЛИСТАХ НЕСКОЛЬКИХ ГОРОДСКИХ ГАЗЕТ ПРОМЕЛЬКНУЛА НЕБОЛЬШАЯ ЗАМЕТКА ПРО АВАРИЮ НА НЕФТЕПРОВОДЕ «ДРУЖБА» В РАЙОНЕ Д. ВЫСОКОЕ (КАМЕНЕЦКИЙ РАЙОН). АВАРИЯ НЕ ОЧЕНЬ ЗНАЧИТЕЛЬНАЯ, НО ВСЁ ЖЕ: ПОЛСОТНИ ТОНН СЫРОЙ НЕФТИ РАЗЛИЛОСЬ ПО МНОГОСТРАДАЛЬНОЙ ЗЕМЛЕ БЕЛАРУСИ, ЗАГРЯЗНЁН МЕЛИОРАТИВНЫЙ КАНАЛ, ИСПОРЧЕНО ПОЛГЕКТАРА СЕЛЬХОЗУГОДИЙ.


Фото: IREX/ProMedia

Надо отдать должное диспетчеру, быстро перекрывшему задвижки, и везению – по каналу нефть могла распространиться на значительное расстояние, но шлюз, по случаю жары, был закрыт. А быстро соорудить плотину из подручного материала на другом конце канала – слава Богу, умеем быстро. Это факты, а выводы?

Причина аварии – потеря прочности металла трубы. Логично, ведь нефтепровод качает нефть почти тридцать лет. За эти годы ни профилактики, ни капремонта – качает, так зачем мучаться, а прорвёт, так там и заменим, ни к чему затраты на сомнительные замены и ремонты.

Однако возникают вопросы. Нефтепровод приносит прибыль за перекачку нефти, позволяет иметь, хоть небольшой, но козырь, в отношениях с соседями, и вдруг такое бесхозяйственное отношение к нему, – ведь, по сути, «Дружба» находится если не в аварийном, то в предаварийном состоянии. Это что же, пока гром не грянет – не перекрестимся? В той же Польше не было слышно про аварии на «Дружбе», да и в России он неплохо тянет.

Оставим вопросы аварийности на совести технических служб. Меня больше волнует другое. До какой поры мы будем наплевательски относиться к окружающей нас природе. Мы губим растительный и животный мир Беларуси. Те потуги, которые делаются для сохранения природы, сводятся на нет подобными авариями, стремлением получить деньги, экономя на нас же.

Закатить бы крупный штраф за подобную аварию руководству нефтепровода – глядишь, и профилактику бы провели. И более (это конечно мечты) ни капли нефти не испортило бы прекрасную землю нашей родины. В любой стране на Западе после подобной аварии экологи подняли бы страшный вой, а у нас – тишина и покой.

Вот ещё один вопрос. Почему о подобных происшествиях у нас – полное молчание? Две небольшие заметки в СМИ и всё. В той же России аварии освещаются в новостях, а в «демократической Белоруссии» чем меньше информации, тем лучше. Где же право человека на полное и своевременное получение информации? У нас что, нельзя нервировать население?

Мы живём в мире фальши и равнодушия. Каждый из нас в равной мере виноват в том, что творится в Беларуси. Из-за нашего равнодушия идёт уничтожение окружающей нас бесценной природы родины. И расплачиваться за это будем если не мы, то наше же потомство. «После нас, хоть трава не расти», – если у вас такой девиз, то вы уже не люди и даже не звери…

**ДИКИЙ**

## ДАРЭЧЫ

Міністэрства Абароны аб'явіла пра стварэнне вайсковай піраміды:

Кожны, хто прывядзе з сабой у ваенкамат яшчэ трох - вызваляецца ад службы ў войску.

***

Сядзіць у тралейбусе маладая будучая маці з вялікім жыватом. Спадніцы зусім не відаць, толькі голыя ногі. Праходзіць міма стары чалавек, усміхаецца ёй:

- Сын будзе ў Вас...

Яна ўся ззяе і запытвае:

- А скуль вы ведаеце?

- Бараду відаць...

***

Судзяць мужыка за гвалт над глуханямой.

Суддзя мужыку:

- Як жа ты мог? Ды ў цябе, нават, вось столькі сумлення няма (паказвае фалангу пальца)!

Глуханемая, ускокваючы з месца:

- Ыыыы-ыы-ыыы-ы (паказваючы да локця).

***

- Якая розніца для паляўнічага паміж сабакам і лісіцай?

- Прыкладна дзве шклянкі гарэлкі.

(Прыгажосць жанчыны) x (яе розум) x (яе даступнасць) = велічыня пастаянная.

***

Запомніце! Абраны вамі прэзідэнт абмену і звароту не падлягае!

***

Распавядае гулец у пейнтбол:

- ...тут у мяне скончыліся патроны, я дастаю кістачку - і ў рукапашную!

***

Стабільнасць - прыкмета адсутнасці ідэй.

***

На свеце існуе ўсяго тры катэгорыі людзей: адныя ўмеюць лічыць, а другія - не.

***

Аб'ява. Аддам кацяня ў добрыя, ласкавыя, пяшчотныя, цёплыя рукі, ці ўтаплю. Тэл.: 77-77-77. Спытаць Дзіму.

***

- Ведаеш, што трэба зрабіць, каб я не прыдушыў гэтага мярзотнага сабаку?

- Што?

- Яго трэба ўтапіць!

***

- Што рабіць, калі вашая жонка прыйшла з кухні і пачала лаяцца на вас?

- Укараціць ланцуг.

Ці ведаеце вы, што...

згодна дадзеных судовай статыстыкі, яшчэ ніводная жонка не застрэліла мужа ў той момант, калі ён мыў посуд.

***

Ідзе беларус, насустрач яму расеец, ды пытаецца ў беларуса:

- Што ты йдзеш, чаго шукаеш?

- Вось Зямлі шчаслівай шукаю...

- А! Глупства! Добра там, дзе нас няма.

- Ну вось я і шукаю, дзе вас няма!

***

У тэатры:

- Цішэй, уверцюра!

- Ад Уверцюры чую!

***

"Дзядуля Мароз, выходзі!" – крычалі, прытанцоўваючы, дзеці каля прыбіральні.

***

Маленькі хлопчык прыходзіць да мамы і кажа:

- Мамуля, расказаць табе вясёлую гісторыю? Мая няня цяжарная!

- Сынок, а што ж у гэтым вясёлага?

- Не ведаю, але я чуў, як яна паведаміла пра гэта бацьку, і ён сказаў: «Ммда, вясёленькая гісторыя...».

**Dzedzich week-news**

№6 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
лістапад 2002

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 14.12.2002 у 18^00
**Наклад:** 299 асобнікаў.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Дземідзюк, Д. Дзянісаў, Д. Шастак, М. Есіна, А.Верамчук, У. Чаберкус
**Адказны сакратар:** М. Сялягін. **Вёрстка:** А. Ляўчук

**Кантактны тэлефон:** (0162) 22-90-97
**E-mail:** dzedzich@mail.ru